СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ | ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

№ 19 (374)

# Соцыялістычная праца

Орган Васілевіцкага Райкома КП(б)Б

Субота 2 кастрычніка 1943 года.

Бібліятэка АН БССР

## Нашы доблесныя войскі громяць ворага на зямлі роднай Беларусі

### Доблеснай Чырвонай Арміі — дастойную сустрэчу

Чырвоная Армія працягвае імклівае наступленне. Кожны дзень прыносіць новыя перамогі. Пасля заняцця гарадоў Смаленска і Рослаўля, нашы войскі паспяхова прасоўваюцца наперад і кожны дзень вызваляюць сотні насялёных пунктаў нашай роднай Беларусі.

Працоўныя раёна, партызаны і партызанкі! Прыбліжэнне фронта абавязвае нас патроіць сваю баявую і дыверсійную работу, усімі сіламі дапамагаць нашым слаўным войскам хутчэй ачысціць нашу зямлю ад фашысцкай погані. Зараз неабходна яшчэ актыўней і мацней разбураць шляхі зносін, пускаць пад адкос і абстрэльваць варожыя воінскія эшалоны, каб не даць магчымасці немцам падвозіць на фронт жывую сілу і тэхніку, не даць ім вывозіць наша дабро.

Адступаючы пад ударамі Чырвонай Арміі, фашысцкія людаеды на сваём шляху руйнуюць і паляць нашы гарады і вёскі, уганяюць на катаргу ў Германію наша насельніцтва, забіваюць нашых людзей, грабяць маёмасць, забіраюць хлеб і іншыя прадукты. Не даць немцам рабіць іх крывавыя справы — святы абавязак кожнага партызана і партызанкі, кожнага патрыёта нашай Радзімы.

З прыбліжэннем фронта вораг імкнецца засылаць у нашы зоны ўсякага рода шпіёнаў. Задача ўсіх працоўных, партызан і партызанак — павысіць рэвалюцыйную пільнасць, не даць магчымасці пранікаць шпіёнам у нашы рады.

Новымі магутнымі ўдарамі па тылах ворага, дысцыплінаванасцю і арганізаванасцю сустрэнем доблесную Чырвоную Армію.

### АД СОВЕЦКАГА ІНФОРМБЮРО

(З АПЕРАТЫЎНЫХ ЗВОДАК ЗА 29 і 30 ВЕРАСНЯ).

Войскі Стэпного фронта, пасля 3-х дзённых жорсткіх баёў, зламілі супраціўленне праціўніка на прадмостных умацаваннях ракі Днепр і 29 верасня штурмам авалодалі горадам КРЭМЕНЧУГ.

На Кіеўскім напрамку нашы войскі, зламіўшы супраціўленне праціўніка, выйшлі к рацэ Днепр і авалодалі буйным чыгуначным вузлом ДАРНІЦА (апошняя станцыя на подступах да Кіева).

У баях за Дарніцу нашы войскі знішчылі 6.000 салдат і афіцэраў праціўніка, 69 танкаў, 78 гармат. Захоплена многа трафей і палонных. Астаткі часцей адкінулі на правы бераг ракі Днепр.

На Гомельскім напрамку нашы войскі працягвалі паспяховае наступленне. За два дні баёў прасунуліся ад 22 да 27 кіламетраў, занялі звыш 230 насялёных пунктаў, у тым ліку авалодалі горадам ВЕТКА і райцэнтрам Гомельскай обл. — СВЯЦІЛАВІЧЫ.

На Магілёўскім напрамку нашы войскі працягвалі паспяховае наступленне, прасунуліся наперад ад 22 да 40 км., занялі звыш 540 нас. пунктаў і, фарсіраваўшы раку Сож, з боем авалодалі горадам і чыгуначным вузлом КРЫЧАЎ.

На Віцебскім напрамку нашы войскі, развіваючы паспяховае наступленне, прасунуліся наперад да 20 км., занялі горад і чыгуначную станцыю Смаленскай обл. РУДНЯ і 150 насялёных пунктаў.

Авіяцыя Чорнаморскага флота патапіла транспарт праціўніка водазмяшчэннем 8.000 тон, 5 самаходных барж і 2 катэры.

Авіяцыяй Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота патоплен у Балтыйскім моры нямецкі транспарт водазмяшчэннем 5 тыс. тон.

На працягу 28 і 29 верасня нашы войскі на ўсіх франтах падбілі і спалілі 141 нямецкі танк, у паветраных баях збіта 88 самалётаў праціўніка.

### Налёты нашай авіяцыі

У ноч на 30 верасня наша авіяцыя бамбардыравала скапленні нямецкіх войск і воінскіх эшалонаў на чыгуначных вузлах Віцебск, Орша, Магілёў, Джанкой.

У выніку бамбардыроўкі ўзніклі вялікія пажары, працягваўшыяся выбухамі. Усе нашы самалёты звярнуліся на свае базы.

### Звярнулі сялянам 200 галоў жывёлы

Нямецка-фашысцкія мярзотнікі, паляучы нашы вёскі, забіралі ў сялян апошнюю жывёлу і зганялі яе ў нямецка-паліцэйскі гарнізон В.

Гітлераўцы хацелі нарабаваную жывёлу ў сялян адправіць у Германію. Аб гэтым даведаліся партызаны атрада, якім камандуе Сямён С. і парашылі адабраць жывёлу ад гітлераўцаў і звярнуць яе сялянам.

30 верасня група партызан пад камандаваннем Аляксея Т. захапіла 200 галоў буйнай рагатай жывёлы. Вялікую дапамогу аказаў партызанам мясцовы жыхар Нікалай С.

Уся жывёла, адабраная ад гітлераўцаў, раздана сялянам.

С. Ш.

# БЯЗЛІТАСНА ЗНІШЧАЦЬ НЯМЕЦКІХ КАТАЎ!

## З узбраеннем перайшлі да партызан

У Н-скі партызанскі атрад за апошнія два тыдні перайшло многа паліцэйскіх і так званых „добраахвотнікаў". У атрадзе іх сустрэлі партызаны цёпла і радушна.

Зараз былыя паліцэйскія і „добраахвотнікі" баявымі справамі ў барацьбе з нямецкімі захопнікамі стараюцца апраўдаць сябе перад Радзімай і сваім народам.

Ніжэй мы друкуем пісьмы былых так званых „добраахвотнікаў" і паліцэйскіх. Іх прыкладу павінны следваць усе, хто з-за страха ці ашуканства ўсё яшчэ працягвае служыць немцам.

## Агульнымі сіламі будзем дабіваць немцаў

Находзячыся больш года ў нямецкім палоне мы перанеслі многа пакут і гора. За калючай праваламай палонных марылі голадам, збівалі гумавымі палкамі. Потым нас прымусілі ўступіць у так званыя „добраахвотнікі". Аднак у нас не было і сотай долі жадання служыць нямецкім душагубам. І вось, у верасні месяцы мы, як і многа другіх нашых таварышоў, пакінулі пазорнае для нас, рускіх, месца і ўліліся ў Н-скі партызанскі атрад. У атрадзе нас сустрэлі цёпла і клапотліва.

Зараз мы разам з партызанамі бязлітасна помсцім ворагу за ўсе здзекі над нашым народам. Актыўнай барацьбой супроць агульнага нашага ворага—немцаў, мы апраўдаем сябе перад Радзімай і сваім народам.

Паліцэйскія і так званыя „добраахвотнікі" і іншыя, хто яшчэ працягвае служыць немцам! Настаў час канчатковай расплаты з немцамі. Пад ударамі Чырвонай Арміі нямецкія войскі, кідаючы тэхніку, боепрыпасы і ўсю іншую ваенную маёмасць, у беспарадку бягуць з нашай зямлі. Выступайце са зброяй у руках супроць нашага агульнага ворага—немцаў. Дзе толькі сустрэнеце немцаў—біце іх. Пераходзьце са зброяй да партызан. Гэта вам дасць магчымасць іскупіць сваю віну перад Радзімай і народам.

Е. Насалевіч,
М. Кальцоў,
І. Шумскіх.

## Апраўдаем сябе перад Радзімай

Фашысты прымусілі нас служыць у паліцыі. Яны хацелі направіць нас супроць свайго народа. Але мы павярнулі зброю супроць нямецкіх акупантаў і перайшлі да партызан.

Мы ўжо хадзілі на чыгунку, абстралялі варожы воінскі эшалон. Актыўнай барацьбой супроць гітлераўскіх акупантаў апраўдаем сябе перад Радзімай.

Мы заклікаем паследваць нашаму прыкладу тых, хто яшчэ працягвае служыць немцам. Біце гітлераўскіх людаедаў, пераходзьце да партызан!

МаксімК., Нікалай К.,
Валодзя Б., Нікалай Н.

## Надзейна захавалі сваё дабро

Пры адступленні нямецкія палачы паляць нашы вёскі і гарады, грабяць наша дабро.

Каб не даць немцам забраць нашы сродкі, на сваім сходзе сяляне аднадушна рашылі: „Захаваць хлеб ад фашысцкіх нарабаўнікаў і найбольш засеяць азімых, каб было ў дастатковай колькасці для сябе і для доблеснай Чырвонай Арміі, якая хутка вызваліць нас з фашысцкага палону".

Сваё рашэнне сяляне ажыццявілі на справе. Зараз яны надзейна захавалі сваё дабро.

Гітлераўскія мярзотнікі спрабавалі забраць у сялян жывёлу, але кожны раз мы ўганялі яе ў лес, намер гітлераўцаў дарэмны.

Не спажываць немцам наша багацце.

Сялянін вёскі З.—
Міхаіл Б.

## Баявыя справы партызан

Новымі баявымі справамі адказваюць партызаны атрада імені Панамарэнка на зварот воінаў-беларусаў.

За апошнія дні партызаны абстралялі тры варожыя воінскія эшалоны. Меткім агнём з ПТР і кулямётаў выведзена са строю тры паравозы, забілі тры фрыцы.

У гэтых аперацыях адлічыліся бронебойшчык Нікалай Б. і кулямётчык Валодзя Ш.

* * *

Партызаны Н-скага атрада 26 верасня выйшлі на чыгунку і разрушылі чыгуначнае палатно на адлегласці 3-х кіламетраў.

У разрушэнні чыгуначнага шляху прымала ўдзел 90 сялян вёсак В., Х., К. і другіх.

## ЗА МЯЖОЙ

### Ваенныя дзеянні ў Італіі

Як афіцыяльна паведамляецца, на ўзбярэжжы Адрыятычнага мора войскі саюзнікаў атакавалі раку Афанто і занялі пункт Чэрыньола.

На цэнтральным участку англійскія войскі занялі Спінацадо, Ацелу і Мура. Часці 5-й амерыканскай арміі занялі Калабрыто і Калсано. Войскі саюзнікаў захапілі 2.000 палонных.

Італьянскі кароль Віктар Эмануіл і маршал Бадольо абасноваліся разам з членамі італьянскага ўрада ў часова назначанай сталіцы, у адным з паўднёвых гарадоў Італіі.

### Баі на Корсіке

Як паведамляе агенцтва Афі за апошнія дні немцы страцілі на востраве Корсіка 1.000 салдат забітымі і некальві сот палонных.

Захапіўшы ўсе важнейшыя ў раёне Басці высоты, саюзнікі аколасілі горадам. Таксама заняты пункты Олето, Ольмето. Немцы адступаюць па ўсяму фронту і знаходзяцца зараз у паўночна-ўсходнім кутку Корсікі. Французскія войскі працягваюць разам з партызанамі цясніць немцаў к узбярэжжу.

РЭДКАЛЕГІЯ.

Ф—115 Выданне Васілевіцкага РК КП(б)Б м. Васілевічы.